ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 17 (690) | Аўторак, 17 мая 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ПЛЕНУМ ЦК КПБ

**13 мая адбыўся X пленум ЦК КПБ.**

**Пленум разгледзеў пытанне «Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі па ўдасканаленню народнай асветы і ідэалагічнаму забеспячэнню перабудовы ў адпаведнасці з рашэннямі лютаўскага (1988 г.) Пленума ЦК КПСС».**

**З дакладам выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Я. Я. Сакалоў.**

**Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова.**

**Разгледжана арганізацыйнае пытанне. У сувязі з пераходам на іншую работу вызвалены: М. Ц. Гулеў — ад абавязкаў загадчыка аддзела лёгкай прамысловасці і тавараў народнага спажывання ЦК КПБ; М. І. Дзямчук — ад абавязкаў загадчыка аддзела навукі і навучальных установ ЦК КПБ; А. І. Трутнеў — ад абавязкаў загадчыка аддзела цяжкай прамысловасці ЦК КПБ.**

**У рабоце пленума прынялі ўдзел першы намеснік загадчыка Аддзела навукі і навучальных установ ЦК КПСС В. В. Рабаў і інструктар Аддзела прапаганды ЦК КПСС П. І. Надолішні.**

**У заключэнне выступіў першы сакратар ЦК КПБ Я. Я. Сакалоў.**

## ПРА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ УНІВЕРСІТЭТА

12 мая наш універсітэт наведаў намеснік загадчыка Аддзела навукі і навучальных установ ЦК КПСС В. С. Балтрунас. У рэктараце адбылася размова, у якой прыняў удзел першы сакратар Гомельскага гаркома КПБ У. Р. Казлоўскі, аб перспектывах далейшага развіцця ГДУ, магчымасцях адкрыцця ў ім медыцынскага факультэта.

## НАШ УКЛАД

Аб актыўнай жыццёвай пазіцыі савецкіх людзей, іх гарачым жаданні змагацца за мір сведчаць іх добраахвотныя грашовыя ўзносы ў Савецкі Фонд міру. Дзесяткі мільёнаў грамадзян, працоўныя калектывы краіны пералічваюць пэўную частку свайго заробатку, прэміі ў фонд, які мы з поўным правам можам назваць «фондам нашых сэрцаў».

Члены шматтысячнага калектыву нашага універсітэта таксама прымаюць актыўны ўдзел у гэтай высакароднай справе. У гэтым годзе ў Савецкі Фонд міру яны ўнеслі 3,5 тыс. рублёў. Найбольшую актыўнасць у зборы сродкаў праявілі выкладчыкі і супрацоўнікі кафедр грамадскіх навук, студэнты геалагічнага факультэта.

## ДУШОЙ — МАЛАДЫЯ!

Яшчэ нямала, напэўна, спартыўных рэкордаў устанавілі б яны, каб не ўварвалася ў мірнае жыццё савецкіх людзей Вялікая Айчынная вайна. І змянілі спартсмены турнік на вінтоўку, пайшлі на фронт, каб абараніць гонар і незалежнасць сваёй Радзімы ад фашызму. Прайшлі яны цяжкімі дарогамі вайны, набліжаючы светлы дзень Перамогі. А калі савецкія людзі зноў змаглі вярнуцца да мірнай стваральнай працы, сталі ў спартыўны строй і даваенныя чэмпіёны, каб устанаўліваць новыя рэкорды.

Многіх з іх цяпер называюць ветэранамі спорту, і ведалі адзін аднаго даўно, а вось сустрэцца зноў давялося ім у гэтыя майскія дні—напярэдадні 43-й гадавіны Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Адбылася гэта сустрэча, дзякуючы савету музея ГДУ «Гомельшчына спартыўная», які запрасіў ветэранаў спорту, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны на святочны «агеньчык», прысвечаны дню Перамогі. Золата баявых і спартыўных узнагарод на грудзях, белізна на скронях, яркая чырвань майскіх кветак — гэтыя колеры стварапі сапраўды святочную атмасферу ў пакоі музея, куды прыйшлі майстар спорту па акрабатыцы, неаднаразовы чэмпіён Беларусі Міхаіл Дзмітрыевіч Чарданцаў, адны з лепшых футбалістаў 30-х гадоў Міхаіл Мікалаевіч Сімкоўскі і Баляслаў Валер'янавіч Расінскі, заслужаны трэнер БССР Якаў Трафімавіч Церашкавец, адзін з лепшых пасляваенных баксёраў Гомельшчыны Генадзь Мікалаевіч Ракіцкі, першы дэкан факультэта фізічнага выхавання нашай ВНУ Дзмітрый Іванавіч Волкаў, іншыя вядомыя ў нашай вобласці і рэспубліцы, спартсмены, трэнеры.

За святочным сталом прагучалі ўспаміны ветэранаў аб іх удзеле ў спартыўным руху, у баях за Радзіму. Вярталіся ў сваю маладосць сівыя ветэраны, спяваючы разам з выкладчыкамі, студэнтамі факультэта фізвыхавання песні ваенных гадоў.

На «агеньчыку» прысутнічаў намеснік старшыні абласнога спарткамітэта К. І. Марачкін.

Госці універсітэта былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі абласнога спарткамітэта.

...За плячыма гэтых паважаных людзей — нялёгкія гады, але душой яны па-ранейшаму застаюцца маладымі!

**В. СЕЛІВАНАЎ,**
**старшы выкладчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання.**



**На здымку: госці ГДУ — ветэраны спорту і Вялікай Айчыннай вайны на святочным «агеньчыку».**
**Фота У. Смірнова.**

*Слова—ветэрану вайны і працы*

## ЗА ЕЎРАПЕЙСКУЮ БЯСПЕКУ І СУПРАЦОЎНІЦТВА

У барацьбу за мір, за міжнародную бяспеку ўключаюцца мільёны людзей планеты. На грэбні хвалі міру ўзнята актыўнасць народаў Еўропы, якія востра адчуваюць сваю адказнасць за будучыню ўсіх зямлян. Двойчы ў бягучым стагоддзі ў Еўропе ўспыхвалі спусташальныя сусветныя войны, а сёння наш кантынент да крайнасці нашпігаваны смертаноснай зброяй, што пагражае самому жыццю не толькі еўрапейцаў, але і ўсяму свету. Народы Еўропы, якія жывуць «на парахавым пограбе» і пад «атамным калпаком», узнялі свой голас у абарону міру, за еўрапейскую бяспеку, за мірнае супрацоўніцтва ўсіх людзей, незалежна ад іх палітычных і рэлігійных перакананняў. Мірная будучыня і супрацоўніцтва пад чыстым небам — гэта шлях да пазбаўлення ад страху, ад сацыяльнага прыгнету, ад беспрацоўя.

У авангардзе барацьбы за мір ідуць народы Савецкага Саюза. Іх волю ў гэтай барацьбе, а таксама і імкненні ўсіх народаў свету, у сваёй дзейнасці выражаюць КПСС і Савецкі ўрад. Пераадольваючы намеры апалагетаў імперыялізму, яны з пазіцыі новага мыслення ў ядзерны век, прымусілі іх лідэраў сесці за стол перагавораў, каб падпісаць першы ў гісторыі дагавор аб ліквідацыі часткі, хаця і нязначнай, стратэгічнай ядзернай зброі ў Еўропе. Але гэта толькі пачатак. Мэта Савецкага Саюза — поўнае знішчэнне да канца гэтага стагоддзя ўсіх відаў зброі: тэрмаядзернай, хімічнай, біялагічнай. Таму барацьба за без'ядзерны свет павінна стаць яшчэ больш актыўнай, а ўклад у яе кожнага з нас — яшчэ больш важкім.

Са святкаваннем 43-й гадавіны Перамогі над фашысцкай Германіяй супаў «Усесаюзны тыдзень дзеянняў за еўрапейскую бяспеку і супрацоўніцтва», які праводзіўся з 7 па 14 мая. Праходзіў ён і ў ГДУ па плану універсітэцкага камітэта абароны міру. Адбыліся сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, праведзены тэматычныя гутаркі і канферэнцыі.

На матэматычным факультэце была арганізавана сустрэча калектыву выкладчыкаў і студэнтаў, прысвечаная дню Перамогі і барацьбе за мір. У студэнцкія групы ў госці да моладзі прыйшлі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны Г. С. Мільчанка, А. Н. Бекарэвіч, В. П. Рубанік, М. А. Ялецкі, А. Д. Ложкін.

Кіраўніцтва фізічнага факультэта наладзіла сустрэчы студэнтаў з Героем Сацыялістычнай Працы М. А. Дзмітрыевым, палкоўнікам у адстаўцы А. І. Украінцам, аўтарам гэтых радкоў. На сустрэчах юнакі і дзяўчаты задавалі шмат пытанняў ветэранам, завязалася гутарка па праблемах міру і пра абавязак кожнага ў барацьбе за яго.

Праведзена канферэнцыя студэнтаў і выкладчыкаў на біялагічным факультэце, прысвечаная гераізму савецкага народу на фронце і ў тыле ў суровыя гады вайны. На ёй выступіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, дацэнт В. І. Хількевіч.

У студэнцкіх групах на факультэце фізічнага выхавання адбыліся гутаркі з моладдзю ветэранаў Я. А. Семенчука, М. Я. Карабанава і А. А. Касцікава.

Успамінаючы грозныя гады вайны, яе ветэраны заклікалі юнакоў і дзяўчат захоўваць у сваёй памяці імёны загінуўшых у баях воінаў і ахвяр фашысцкіх засценкаў. Не аб асабістых подзвігах гаварылі ветэраны, а аб тых героях, што прымалі агонь на сябе, пракладваючы тым самым шлях да Перамогі сваім паслядоўнікам, каб яны, падхапіўшы сцяг Перамогі, данеслі яго да купала рэйхстага і затым перадалі нашчадкам. З гэтым сцягам яны ідуць у бой за без'ядзерны свет.

**В. СІМАНАЎ,**
**член камітэта абароны міру ГДУ.**

## ДНІ КУЛЬТУРЫ ПОЛЬСКІХ СЯБРОЎ

З 20 па 25 мая пройдуць Дні культуры Еленегурскага ваяводства ў г. Гомелі. На гэтым тыдні ў суботу маладзёжная група з Польскай Народнай Рэспублікі стане госцем нашага універсітэта. Культурнай праграмай прадугледжана сустрэча пасланцоў горада-пабраціма з членамі Клуба інтэрнацыянальнай дружбы «Саюз», выступленне ў актавай зале рок-групы. У фае вучэбнага корпуса № 1 будзе працаваць відэацэнтр, а ў шахматна-шашачным клубе інтэрната № 2 — дыскусійны цэнтр.

## Віншуем!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра матэматычных праблем кіравання горача віншуюць старшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі сістэмнага праграміравання ХВЕШЧУКА Уладзіміра Іванавіча (навуковы кіраўнік— загадчык кафедры МПК дацэнт І. В. Максімей) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.**

